# УНІВЕРСІТЭЦКІ ДРУК У СІСТЭМЕ СРОДКАЎ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

**Г.В. Навасельцава**
*Віцебск, ВДУ*

Паводле паказчыкаў моцнай навуковай традыцыі і багатай гісторыі развіцця прэсы, журналістыка найперш разглядаецца як своеасаблівы духоўны феномен. Збор і распаўсюджанне інфармацыі не магло б адбыцца без такіх базавых, структураўтваральных катэгорый сродкаў масавай інфармацыі, як свабода і крытычнасць мыслення. Невыпадкова С.Г. Карканосенка, вызначаючы метадалагічную базу тэорыі журналістыкі, спыняецца на шэрагу сутнасных характарыстык прэсы. Да іх ліку адносяцца рысы, што дакладна вызначаюць журналістыку ў яе рэальным бытаванні: “полімарфізм, варыябельнасць пры выбары методык і зместу працы, адаптыўнасць (і, адпаведна, зменлівасць) пры сутыкненні з новымі нестандартнымі сітуацыямі і задачамі” [1, с. 99]. Даследчык падкрэслівае, што журналістыка яшчэ і працэс, неперырыўная дынаміка, а не толькі сацыяльны інстытут. Развіццё журналістыкі і паводзіны супрацоўнікаў СМІ, а разам з імі і аўдыторыі, дэтэрмінуюцца актуальнымі праблемамі і задачамі сучаснасці больш выразна, чым у выпадку з іншымі сацыяльнымі з’явамі.

Ведучы размову пра вызначальную характарыстыку прэсы як грамадска-сацыяльнай з’явы, варта прыгадаць некаторыя паказальныя прыклады яе гістарычнага станаўлення. У працэсе развіцця журналістыкі выпрацоўваліся названыя вышэй спецыфічныя катэгорыі, пра што сведчаць многія ўзоры з гісторыі беларускай і рускай прэсы. Калі прасачыць працэс зараджэння і станаўлення, у прыватнасці, рускага перыядычнага друку ў самых асноўных вехах, адзначае А.А. Грабельнікаў, то “можна лёгка прыйсці да высновы, што амаль увесь ён вядзе свой пачатак ад універсітэцкіх газет і часопісаў” [2, с. 27]. У XVIII–XIX стагоддзях большая частка газет і часопісаў была заснавана прафесарамі і студэнтамі – выпускнікамі ўніверсітэтаў і вышэйшых навучальных устаноў. У той час універсітэты былі цэнтрамі асветы і адыгрывалі значную ролю ў культурным развіцці.

Паказальна, што ўжо першая руская газета “Ведамасці”, створаная Пятром І ў 1728 годзе, была перададзена Акадэміі навук і выданнем газеты займаўся Міхаіл Ламаносаў. Першай універсітэцкай газетай сталі “Маскоўскія ведамасці”, заснаваныя ў 1756 годзе. У выданні рэгулярна публікаваліся звесткі пра святочныя мерапрыемствы, новыя курсы лекцый, прадстаўленыя да абароны дысертацыі. Газета сачыла за паспяховасцю студэнтаў, друкавала спісы ўзнагароджаных за поспехі ў навуцы, а таксама публікавала навіны з-за мяжы, прыдворную хроніку. Інфармацыйная насычанасць рабіла яе запатрабаванай не толькі Маскоўскім універсітэтам, але і больш шырокай аўдыторыяй – гарадской.

З гісторыі беларускага друку варта згадаць выданне, якое праіснава больш за паўтара стагоддзя і аказала вялікі ўплыў на развіццё беларускай культуры. Гэта “Віленская літаратурная газета” (“Газета літэрацка віленьска”), якая ў 1760 годзе пачала выдавацца Віленскай езуіцкай акадэміяй, затым Вышэйшай літоўскай школай, пераўтворанай у 1803 годзе ў Віленскі ўніверсітэт – цэнтр навукі і асветы краю. Першым рэдактарам газеты стаў доктар філасофіі, выхадзец з Беларусі, які працаваў выкладчыкам у Варшаве, а пазней у Віленскай езуіцкай акадэміі, – Францішак Папроцкі. За доўгі час свайго існавання газета змяніла не толькі значную колькасць рэдактараў і супрацоўнікаў, сярод якіх – знакамітыя дзеячы навукі і культуры, мянялася сама назва: “Кур’ер Віленскі”, “Літоўскі веснік”, “Віленскі

Рэпазіторый ВДУ

веснік”. На пачатку сваёй дзейнасці газета з’яўлялася грамадска-палітычным выданнем сталіцы Вялікага княства Літоўскага, потым – цэнтра Паўночна-Заходняга краю, і мела афіцыйны характар. У 50-ыя гады XIX стагоддзя характар і змест публікацый “Віленскага весніка” істотна мяняецца. Рэдактарам і выдаўцом газеты становіцца вядомы грамадскі дзеяч, даследчык беларускай гісторыі, фальклору і краязнаўства Адам Кіркор, які прыцягваў да супрацоўніцтва з выданнем вядомых вучоных, пісьменнікаў і публіцыстаў. У выніку ідэйна-тэматычны змест робіцца больш разнастайным, пашыраецца і паглыбляецца тэматыка. Публікуюцца нарысы і падарожныя нататкі па гісторыі ўзнікнення і развіцця беларускіх гарадоў, пра дзеячаў культуры, аповяды пра славутае мінулае славянскіх народаў.

Адметнай з’явай у гісторыі беларускага друку сталі канфесійныя выданні. Рэлігійны друк на Беларусі ў другой палове XIX стагоддзя быў значнай і ўплывовай з’явай грамадскага жыцця. Акрамя “Літоўскіх епархіяльных ведамасцей”, выходзілі яшчэ “Мінскія…”, “Полацкія…”, “Магілёўскія…”, “Гродненскія епархіяльныя ведамасці”. Выданні пастаянна, з нумара ў нумар, змяшчалі адукацыйныя палажэнні і інструкцыі, інфармацыйныя паведамленні з духоўных вучылішчаў, гадавыя справаздачы пра стан адукацыі ў розных рэгіёнах. Такім чынам, “…епархіяльныя ведамасці” выконвалі не проста інфармацыйную, але і рэгулятыўную функцыі ў сферы пачатковай і сярэдняй адукацыі Паўночна-Заходняга краю.

У пачатку XX стагоддзя, багатага на грамадска-гістарычныя зрухі, адной з асноўных тэндэнцый развіцця прэсы вызначылася дыферэнцыяцыя паводле праблемна-тэматычнай прыкметы. Журналістыка набывае па-сапраўднаму масавы характар, і ўніверсітэцкія выданні, якія існавалі ў рэчышчы студэнцкай прэсы і студкораўскага руху, не могуць канкурыраваць з масавымі грамадска-палітычнымі выданнямі. У агульным аб’ёме савецкіх шматтыражак вузаўскай прэсы было няшмат, найбольш распаўсюджанымі аказаліся вузаўскія друкаваныя газеты, якія не патрабавалі вялікіх сродкаў і ў большасці выпадкаў выраслі з насценных газет. Калі ў вышэйшай навучальнай установе ўласнай газеты не было, месца для студэнцкіх публікацый прадстаўлялі мясцовыя грамадска-палітычныя выданні. Пры гэтым адны выданні для асвятлення студэнцкага жыцця рэгулярна адводзілі па паласе, а іншыя выданні змяшчалі традыцыйныя невялікія рубрыкі, якія запаўняліся нататкамі, што раскрывалі агульную храналогію падзей. Вызначаючы агульны накірунак развіцця ўніверсітэцкага друку ў савецкі час, варта звярнуць увагу на тое, што студэнцкія газеты пактычна былі манапалістамі вузаўскай тэматыкі, а грамадска-палітычныя выданні ў шэрагу іншых актуальных тэм і праблем асвятлялі жыццё моладзі. У цэлым на працягу XX стагоддзя склалася разгалінаваная сістэма студэнцкай прэсы, якая існуе да сённяшняга часу.

Акрэсліваючы спецыфіку вузаўскіх і студэнцкіх выданняў ў сістэме сродкаў масавай інфармаці, важна адзначыць, што гэтыя выданні, у адрозненне ад іншых СМІ – рэспубліканскіх, абласных, гарадскіх, раённых, найбольш блізкія да сваёй аўдыторыі. Не будзе перабольшваннем сказаць, што ўніверсітэцкая шматтыражная газета “Мы і час”, якую ствараюць найбольш творчыя студэнты розных факультэтаў і розных курсаў, блізкая сваёй аўдыторыі. Наяўнасць у вышэйшай навучальнай установе свайго выдання сведчыць пра тое, што яна жыве паўнавартасным жыццём: такое выданне выконвае не толькі інфармацыйную функцыю, але і выхаваўчую – абагульняе вопыт, садзейнівае фарміраванню сацыяльнай і грамадскай культуры, светапоглядную – спрыяе станаўленню агульнай сістэмы поглядаў і ўяўленняў, рэгулятыўную – забяспечвае ўзаемадзеянне студэнцтва як сацыяльнай групы з грамадствам. Такім чынам, універсітэцкая газета выступае як

Рэпазіторый ВДУ

неадʼемная частка сродкаў масавай інфармацыі, што цесна ўзаемадзейнічае са сваёй аўдыторыяй і знаходзіцца ў выразна акрэсленай інфармацыйнай тэматычна-праблемнай прасторы.

ЛІТАРАТУРА


1. Корконосенко, С.Г. Теория журналистики: моделирование и применение / С.Г. Корконосенко. – М.: Логос, 2010. – 248 с.
2. Грабельников, А.А. Между прошлым и будущим / А.А. Грабельников // Alma mater. Вестн. высш. шк. – 2000. – №3. – С. 27–30.


## ГОГОЛЬ Н.В. И ТОЛСТОЙ Л.Н.
## (сопоставительное литературоведение)


**А.А. Нестеренко**

*Витебск, ВГУ*


В период 50-х годов XIX века Толстого беспокоило то, что ряд русских писателей, по крайней мере, к 1851 году, был не оценен в должной мере литературной критикой: это Дружинин, Григорович, Тургенев, Гоголь, Гончаров.

Не случайно в отзывах на первые произведения Толстого зазвучали из разных уст дружные оценки его как продолжателя реализма Гоголя. О второй части автобиографической трилогии «Отрочество» (1854) восторженно писали: Некрасов – Тургеневу, Боткин – Некрасову, Панаев – Лонгинову, Тургенев – Колбасину.

За два года до этого умер Гоголь. Русская литература осиротела, и людям, преданным литературе, естественно, представлялся вопрос: кто теперь будет преемником Гоголя? Вопрос этот заинтересовал и Тургенева, и вот что он писал Л.Н. Вакселю в октябре 1854 года: «Прочтите "Отрочество" в 10 книге "Современника". Вот наконец преемник Гоголя». То же самое писал Тургенев И.Ф. Миницкому в ноябре того же года: «В 10 № "Современника" вы найдёте повесть Толстого, автора "Детства" – перед которою все попытки кажутся вздором. – Вот наконец преемник Гоголя, нисколько на него не похожий, как оно и следовало». Очень тонкая характеристика реализма Толстого: он продолжает реалистическую традицию Гоголя, но в новом качестве.

Замечательное письмо Некрасова к Толстому от 2 сентября 1855 года имеет очень важное значение для уяснения отношения Некрасова к молодому писателю (Толстой на 7 лет моложе редактора «Современника»). Упомянув вкратце о том «возмутительном безобразии», которое было произведено цензурой над рассказом «Севастополь в мае», Некрасов далее переходит к общей оценке творчества Толстого. «Не хочу говорить, – пишет он, – как высоко я ставлю эту статью и вообще направление вашего таланта и то, чем он вообще силён и нов. Это именно то, что нужно теперь русскому обществу: правда – правда, которой со смертию Гоголя так мало осталось в русской литературе». Этими словами Некрасов, как раньше Тургенев, признавал Толстого преемником Гоголя в русской литературе, – того Гоголя, которого так высоко ставила вся редакция «Современника», на смерть которого Некрасов написал свои проникновенные стихи…

В июне-июле 1856 года в дневнике Толстого отмечено чтение Пушкина и Гоголя. После Пушкина Толстой «с наслаждением» перечитывает «Мёртвые души» Гоголя, находя в них «много своих мыслей».

Репозиторий ВГУ